К. Т. Аникиевич. – Витебск : Витеб. обл. упр. статистики, [19?]. – 150 с. – Репринт. воспроизв. изд. Могилев. губерн. стат. ком. 1907 г.

2. **Бараноўскі, А. В.** Полымя (Беліца): гісторыя маёнтка і вёскі / А. В. Бараноўскі ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Віцеб. дзярж. ун-т. – Віцебск : ВДУ, 2015. – 39 с.

3. **Звязаны** лёсам з Сенненшчынай : біягр. давед. / [склад. А. В. Бараноўскі]. – Віцебск : ВДУ, 2017. – 67 с.

4. **Мядзведзева, В.** Археалагічнае вывучэнне Сенненскага краю (ХІХ–ХХІ стст.) / В. Мядзведзева, К. Мядзведзеў // Сенненскі край: гісторыка-культурная спадчына рэгіёна : зб. навук. арт. навук.-практ. канф., Сянно, 1–2 ліп. 2022 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. А. В. Бараноўскі ; рэдкал.: В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2023. – С. 29. – (Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі).

***Субоцін А.А.*** *(г. Віцебск)*

# АПІСАННЕ КЛІМАТЫЧНЫХ З’ЯЎ У ВІЦЕБСКІМ ЛЕТАПІСЕ ПАНЦЫРНАГА І АВЕРКІ

У сённяшнім грамадстве вялікую цікавасць як у навукоўцаў, так і ў звычайных жыхароў нашай планеты выклікаюць праблемы змены клімату. Такія змены могуць значна паўплываць на эканоміку, сацыяльныя і нават палітычныя працэсы. Апошнім часам мы часта назіраем катаклізмы, звязаныя з анамальнай спякотай або анамальным холадам, ураганамі і нехарактэрнымі кліматычнымі з’явамі для пэўнага рэгіёна ў асобныя сезоны каляндарнага года. Факты прыродных катаклізмаў не з’яўляюцца новымі, іх можна было назіраць і ў папярэднія перыяды існавання грамадства, на што ўказваюць пісьмовыя крыніцы мінулых стагоддзяў. У прыватнасці, сведчанні пра кліматычныя катаклізмы мы можам знайсці ў Віцебскім летапісе Панцырнага і Аверкі.

Апісанне кліматычных з’яў у Віцебскім летапісе можна ўмоўна падзяліць на дзве групы. Першая група запісаў датычыцца сведчанняў, якія былі зафіксаваны непасрэдна ў Віцебску ў XVII – пачатку XVIII ст. Другая група запісаў звязана з упамінаннем кліматычных з’яў на аснове польскіх хронік і, як правіла, датычыцца ўсёй тэрыторыі ВКЛ або Польшчы.

Першым у групе фактаў лакальных падзей, звязаных з кліматычнымі з’явамі, Віцебскі летапіс упамінае вялікі голад 1601 г., прычынай якога ўказваецца «mrozubicie» [2, с. 194]. Гэтае кароткае сведчанне супадае з данымі іншых пісьмовых крыніц ВКЛ і рускіх зямель. Менавіта на 1601–1603 гг. з-за няўстойлівых умоў надвор’я прыходзіцца вялікі голад у Маскоўскім царстве, што прывёў да палітычнага крызісу ў гэтай дзяржаве [1, с. 106]. У ВКЛ, у прыватнасці, пра раннія маразы восенню 1601 г. і, як вынік, неўраджай упамінае Баркулабаўскі летапіс. Тут гаворыцца пра тое, што ў канцы верасня частымі

былі дажджы з громам, а 4 кастрычніка выпаў вялікі снег, які засыпаў усе пасевы і прычыніў вялікую шкоду збожжу. З 10 кастрычніка цэлы тыдзень ішоў снег з моцным ветрам. Узровень снежнага покрыва летапісец адзначаў «до полголени». Ад вялікіх маразоў замерз Днепр, і па ім ездзілі на санях, як зімой. Такія ўмовы не дазволілі своечасова скончыць земляробчыя працы, і сялянам прыходзілася літаральна з-пад снегу збіраць збожжа [2, с. 187–188].

Адметнымі сярод прыродных з'яў, апісаных летапісам Панцырнага і Аверкі, былі разлівы Заходняй Дзвіны, якія прыводзілі да паводкаў. Так, у 1686 г. Віцебскі летапіс апісвае вялікую вясеннюю паводку, што затапіла падвор'і жыхароў Віцебска і знесла цячэннем іх дамы [2, с. 196]. Яна адбылася з-за шматснежнай зімы 1685/1686 гг. Пра такія кліматычныя ўмовы сведчыць і другая гарадская хроніка XVIII ст. – Магілёўская хроніка Т. Сурты і Ю. Трубніцкага. У ёй расказваецца пра шматснежную і марозную зіму 1685/1686 гг. у Магілёве, у выніку чаго тут таксама назіраліся разводдзе Дняпра і вялікая паводка [3, с. 246]. Пра вялікую летнюю паводку летапіс Панцырнага і Аверкі паведамляе пад 1688 г., калі, хутчэй за ўсё, з-за працяглага дажджу 17 чэрвеня Заходняя Дзвіна так разлілася, што затапіла вуліцы Віцебска [2, с. 200]. Пра вялікую паводку, але ўжо восеннюю, Віцебскі летапіс упамінае пад 1700 г. Тут таксама з-за працяглых дажджоў разлілася Заходняя Дзвіна, як вясной, і пашкодзіла дамы гараджан [2, с. 197].

Яшчэ адной з кліматычных з'яў, якую апісвае летапіс Панцырнага і Аверкі, быў вялікі град каля Віцебска. Было ўказана, што ён прайшоў 3 жніўня 1694 г. і папсаваў збожжавыя пасевы [2, с. 196]. Што цікава, пра неспрыяльнае надвор'е жніўня 1694 г. мы можам прачытаць і ў Магілёўскай хроніцы. У ёй апавядаецца, што 11 жніўня з паўночнага боку на Магілёў надышла цёмная хмара з громам і пайшоў град памерам з арэх. У выніку буры і граду былі пашкоджаны дамы жыхароў Магілёва і навакольных мястэчак, а таксама знішчаны збожжавыя пасевы [3, с. 247].

Пра неспрыяльныя ўмовы надвор'я і прыродныя катаклізмы Віцебскі летапіс Панцырнага і Аверкі ўпамінае ў наступныя гады. Так, пад 1695 г. летапіс зноў піша пра «mrozobicie», што можна звязаць з маразамі падчас пасяўнога сезона [2, с. 196]. Так, сапраўды, вясна і лета гэтага года былі халодныя і няўстойлівыя, бо далей летапіс гаворыць пра тое, што 26 мая ў Віцебску выпаў снег па калена і ляжаў тры дні [2, с. 196]. Пра падобную тэндэнцыю ў надвор'і 1695 г. кажа і хроніка Т. Сурты і Ю. Трубніцкага. Яна сцвярджае, што 4 ліпеня ў Магілёве выпаў снег і ляжаў некалькі дзён. Магілёўская хроніка ў цэлым пацвярджае сведчанні летапісу Панцырнага і Аверкі і піша пра лета з маразамі, якое выклікала неўраджай збожжавых, а гэта, у сваю чаргу, прывяло да павышэння коштаў на хлеб у 1696 г. [3, с. 248]. Адпаведна ў тэксце Віцебскага летапісу чытаем: «…a w roku 1696 była zboża drogość wielka: solanka żyta była w Witebsku pa talarow dwa bitych». У процілегласць халоднаму 1695 г. зіма 1696 г. аказалася, згодна з Віцебскім

летапісам, цёплай, што нават зямля не пакрылася снегам і не было дарогі для санных перавозак, а Заходняя Дзвіна цэлы год не замярзала [2, с. 196].

Летапіс Панцырнага і Аверкі апісваў грамы і маланкі, якія наносілі шкоду мясцовым будынкам. Так, 15 ліпеня 1697 г. апісваецца маланка, што спаліла ўначы адзін з Віцебскіх замкаў, а ў красавіку 1701 г. на праваслаўны Вялікдзень – моцны гром і маланка, якая ўдарыла ў царкву Яна Багаслова падчас начнога набажэнства і ледзь не спаліла будынак, бо людзі паспелі затушыць пажар і не далі распаўсюдзіцца агню [2, с. 196–197].

Сярод прыродных катаклізмаў Віцебскі летапіс упамінаў пра буры. Так, пад 1697 г. апісваецца моцная бура, якаяназіралася ў Смаленску 20 жніўня, якая сарвала дах, крыжы і званы на адной з цэркваў. Падобнае ж здарэнне адбылося ў Віцебску на наступны год, калі вялікая бура таксама пазрывала дахі з дамоў, а з Заручаўскай царквы знесла купал. Яшчэ адну буру ў Віцебску летапіс Панцырнага і Аверкі згадвае пад 1704 г., калі 18 кастрычніка моцны вецер пашкодзіў дахі дамоў і паламаў крыжы на цэрквах [2, с. 196, 198].

Другая група запісаў пра кліматычныя з’явы і іх наступствы была перанята складальнікамі Віцебскага летапісу ў польскіх храністаў. Пад 1314 г., са спасылкай на Я. Длугаша і М. Бельскага, тут апісваецца цяжкі голад у Польшчы. Далей, спасылаючыся ўжо на М. Кромера, летапіс указвае, што голад з-за вялікіх дажджоў трываў тры гады з 1310 г., а пад 1315 г., са спасылкай на М. Мяхоўскага, указваецца цяжкі трохгадовы голад з прычыны навадненняў [2, с. 201, 203]. У гэтых запісах аўтары Віцебскага летапісу дапусцілі недакладнасці пры працы з тэкстамі пералічаных польскіх храністаў і ёсць некаторыя аўтарскія дабаўленні. Так, напрыклад, у таго ж Я. Длугаша і М. Бельскага голад упамінаецца не пад 1314 г., а пад 1315 г., а М. Кромер проста ўпамінае голад 1310 г. у Польшчы і суседніх краінах з-за дажджоў і навадненняў, не канкрэтызуючы, што ён працягваўся тры гады. Ніжэй М. Кромер кажа пра голад 1315 г., які трываў наступныя два гады [4, p. 91; 6, s. 214; 7, s. 558, 561].

Цалкам верагодна, што голад меў месца ў 1310 г. з-за сырога і халоднага надвор’я, пра гэта, дарэчы, піша Я. Длугаш [4, p. 65]. Што датычыцца наступнага па часе голаду, то ён сапраўды быў зацяжны і працягваўся з 1315 па 1317 г., як і адзначаў у сваіх тэкстах М. Кромер. Факт вялікага еўрапейскага голаду 1315–1317 гг. пацвярджаюць, напрыклад, і сучасныя швейцарскія даследчыкі гісторыі клімату К. Пфістэр і Х. Ванэр. На аснове багатага дакументальнага матэрыялу і шырокага спектра дэндрахраналагічных даных яны вызначылі, што прычынай голаду ў адзначаныя гады былі дрэнныя кліматычныя ўмовы, калі па ўсёй Еўропе ўстанавілася вільготнае і халоднае надвор’е, а летам, восенню і вясной ішлі бесперапынныя дажджы. Адпаведна, гэта выклікала неўраджаі ключавых сельскагаспадарчых культур [8, p. 284].

Аб’яднаўшы звесткі Я. Длугаша, М. Мяхоўскага і М. Бельскага, Віцебскі летапіс Панцырнага і Аверкі апісвае факт выпадзення вялікага снегу летам

1353 г. падчас свята Тройцы. Адзначаецца, што снег праляжаў шэсць дзён і паспрыяў, нягледзячы на гэта, добраму ўраджаю [2, с. 201].

Спаслаўшыся на тэкст «Гісторыі Літвы» А. Віюк-Каяловіча, Віцебскі летапіс расказвае пра голад 1570 г. і ўказвае ў якасці яго прычыны цяжкую і доўгую зіму. Падчас гэтай падзеі, па словах складальнікаў летапісу, людзям прыходзілася есці лісце і выкопваць трупы з зямлі. У прыватнасці, гаворыцца, што на Белай Русі галодныя сабакі нападалі на людзей і загрызалі іх [2, с. 203]. У тэксты і А. Віюк-Каяловіча, і Віцебскага летапісу трапілі звесткі пра вялікі голад 1570–1571 гг., які ўспыхнуў у ВКЛ і Польшчы. Пра яго ўпамінаюць і іншыя пісьмовыя крыніцы. Напрыклад, у Хроніцы М. Стрыйкоўскага голад упамінаецца пад 1570 г., а ў Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай – пад 1571 г. [2, с. 114; 5, s. 419]. Апроч цяжкага эканамічнага становішча ВКЛ падчас Лівонскай вайны голад быў абумоўлены і кліматычнымі катаклізмамі ва Усходняй Еўропе, якія адзначаліся ў 1570–1571 гг. у іншых летапісах, дзе ішла гаворка пра голад, неўраджаі і гібель збожжавых культур [1, с. 194].

Без спасылкі на якую-небудзь крыніцу складальнікамі Віцебскага летапісу ўпамінаецца голад у Вільні, падчас якога загінула 15 тыс. чалавек, а ў аднаго шляхціца збожжа пераўтварылася ў вужоў. Ніжэй асобна напісана дата «roku 1638» [2, с. 203]. Не выключана, што голад у Вільні меў месца ў гэты год, а алегарычнае апісанне пераўтварэння збожжа ў змей можна лічыць фактам таго, што ўраджай хлеба загінуў па прычыне якогасьці кліматычнага катаклізму. Дарэчы, у Заходняй Еўропе пад 1638 г. была зафіксавана моцная засуха, а Хроніка Самавідца на тэрыторыі Украіны ўпамінае пра сухое надвор'е вясной і летам, вынікам чаго стаў неўраджай яравога збожжа [1, с. 209].

Такім чынам, летапіс Панцырнага і Аверкі апісваў кліматычныя з'явы ў Віцебску, якія ўяўлялі сабой небяспеку для чалавечага жыцця і, як правіла, прыносілі шкоду гарадской гаспадарцы, прыводзілі ў некаторых выпадках да неўраджаяў. У гэтым кантэксце Віцебскі летапіс працягнуў традыцыі папярэдніх летапісаў і хронік ВКЛ, якія, упамінаючы пра асаблівасці надвор'я, апісвалі звычайна прыродныя катаклізмы ў якасці Божай кары за чалавечыя грахі. Як наступствы кліматычных катаклізмаў Віцебскі летапіс упамінае пра голад, што таксама з'яўляецца распаўсюджанай тэмай апавядальных крыніц перыяду Сярэднявечча і Ранняга Новага часу. Тэму анамальных кліматычных з'яў і звязанага з імі голаду Віцебскі летапіс працягнуў у наступных частках пры асвячэнні падзей у Польшчы і ВКЛ, дзе інфармацыя абагульнялася з тэкстаў польскіх храністаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Борисенков, Е. П.** Экстремальные природные явления в русских летописях XI–XVII веков / Е. П. Борисенков, В. М. Пасецкий. – Ленинград : Гидрометеоиздат, 1983. – 240 с.

2. **Полное** собрание русских летописей / Ин-т истории СССР. – Москва : Наука, 1975. – Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. – 233 с.
3. **Полное** собрание русских летописей / Ин-т истории СССР. – Москва : Наука, 1980. – Т. 35 : Летописи белорусско-литовские. – 306 с.
4. **Dlugossi, I.** Annales seu cronicae incliti regni Poloniae. Liber nonus / I. Dlugossi. – Varsavie : Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1978. – 509 p.
5. **Kronika** polska, litewska, zmodzka i wszystkiej Rusi Macieja Stryjkowskiego : w II t. – Warszawa : Nak. G. L. Glüsksverga, 1846. – T. II. – 572 s.
6. **Kronika** Polska Marcina Bielskiego. Nowo przez Ioach. Bielskiego, syná iego, wydána. – Kraków : w drukárni Jákubá Sibeneycherá, 1597. – 804 s.
7. **Kronika** polska Marcina Kromera biskupa warmińskiego ksiąg XXX: dotąd w trzech językach, a mianowicie w łacińskim, polskim i niemieckim wydana, na język polski z łacińskiego przełożona przez Marcina z Błażowa Błażowskiego i wydana w Krakowie w drukarni M. Loba roku 1611 : w II t. – Kraków : Księgarnia J. M. Himmelblaua, 1882. – T. I. – 740 s.
8. **Pfister, C.** Climate and society in Europe – the last thousand years / C. Pfister, H. Wanner. – Bern : Haupt verlag, 2021. – 396 p.

***Сумко А.В.*** *(г. Полацк)*

## ЭКСТРЭМАЛЬНАЯ ГАСТРАНАМІЯ ПАВАЕННАЙ ВІЦЕБШЧЫНЫ (па матэрыялах палявых даследаванняў)[1]

Геаграфія даследавання – сучасная тэрыторыя Віцебшчыны, якая ў пасляваенны час складалася з дзвюх абласцей: Полацкай (існавала з 1944 па 1954 г.) і Віцебскай. Рэгіён меў у сваім складзе раёны з рознымі тыпамі сацыяльна-эканамічнага ўкладу (раёны з перавагай аднаасобных гаспадарак і цалкам калектывізаваныя раёны), розным узроўнем дабрабыту насельніцтва і неаднолькавымі стартавымі ўмовамі пасляваеннага аднаўлення. Прадмет даследавання – вырашэнне праблемы харчовага забеспячэння вясковага насельніцтва Віцебшчыны ў першыя гады пасля вызвалення ад нацысцкіх захопнікаў.

Матэрыялы вуснай гісторыі Віцебшчыны і архіўныя дакументы фіксуюць, што рэчаіснасць у гэты перыяд была надзвычай складанай, у першую чаргу для насельніцтва, якое пражывала ў раёнах, якія сталі эпіцэнтрам карных экспедыцый. Шэсць раёнаў Полацкай вобласці (Асвейскі, Ветрынскі, Дрысенскі, Полацкі, Расонскі, Ушацкі) і сем раёнаў Віцебскай (Гарадоцкі,

[1] Артыкул падрыхтаваны ў рамках праекта БРФФД «Стратэгіі выжывання і адаптыўныя практыкі вясковага насельніцтва Паўночнай Беларусі ў пасляваенны перыяд», дамова № Г23ИП-037.